

# КАЛЕГА з моцным характарам і воляй, інтэлігентнасцю, невераготнай працавітасцю

## (да 70-гадовага юбілею Сяргея Аляксандравіча Елізарава)

Напрыканцы сакавіка 2025 г. 70-гадовы юбілей адзначыў доктар гістарычных навук, прафесар кафедры сацыяльна-гуманітарных і прававых дысцыплін Гомельскага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта імя П.В.Сухога, сталы аўтар "Беларускага гістарычнага часопіса" Сяргей Аляксандравіч Елізараў.

Пасля заканчэння ў 1978 г. гістарычнага факультэта БДУ цягам больш як 45 гадоў яго прафесійная дзейнасць звязаная з ГДТУ імя П.В.Сухога, у якім ён прайшоў шлях ад выкладчыка да прафесара, доўгі час выконваў абавязкі намесніка дэкана гуманітарна-эканамічнага факультэта, загадчыка кафедры паліталогіі і гісторыі.

З 1985 г. Сяргей Аляксандравіч працаваў на кафедры гісторыі КПСС і навуковага камунізму дацэнтам, з 1996 г. — дацэнтам кафедры "Паліталогія і гісторыя". Яго прафесійныя, арганізатарскія і асабістыя якасці найбольш яскрава праявіліся на пасадзе загадчыка гэтай кафедры, якую ён узначальваў з 2010 г. па 2015 г. і з вялікай адказнасцю падыходзіў да навукова-выхаваўчага працэсу. За час сваёй працоўнай дзейнасці Сяргей Аляксандравіч паказаў сябе ініцыятыўным, здольным арганізатарам, сапраўдным прафесіяналам.

У 1983 г. юбіляр абараніў кандыдацкую дысертацыю па тэме *"Дзейнасць Кампартыі Беларусі па далейшым развіцці эканамічнай адукацыі працаўнікоў вёскі ў 1970-я гады"* (навуковы кіраўнік — доктар гістарычных навук, прафесар І.В.Царук). У 2012 г. паспяхова абараніў доктарскую дысертацыю па тэме *"Фарміраванне і дзейнасць сістэмы адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу БССР (1919—1991 гг.)"*

*Вокладкі манаграфій С.А.Елізарава.*






*Прафесар С.А.Елізараў (першы справа) сярод супрацоўнікаў кафедры сацыяльна-гуманітарных і прававых дысцыплін.*

(навуковы кансультант — доктар гістарычных навук, прафесар У.К.Коршук), у 2016 г. яму прысвоена навуковае званне прафесара. Трэба адзначыць асаблівую ўдзячнасць Сяргея Аляксандравіча сваім навуковым кіраўнікам, якія істотна паўплывалі на яго станаўленне як навукоўца. Са студзеня 2016 г. па сённяшні час С.А.Елізараў — прафесар кафедры сацыяльна-гуманітарных і прававых дысцыплін Гомельскага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта імя П.В.Сухога.

*С.А.Елізараў пад час абмеркавання студэнцкага навуковага даследавання.*



Прафесар С.А.Елізараў — навуковец, які грунтоўна ведае гістарычныя асаблівасці развіцця мясцовага кіравання і самакіравання ў Беларусі. Ён аўтар звыш 250 навуковых прац, у тым ліку манаграфій, навуковых і навукова-метадычных матэрыялаў. Сяргей Аляксандравіч радуе сваіх калег, студэнтаў, чытачоў новым навуковым досведам у гістарычных часопісах, зборніках матэрыялаў навуковых канферэнцый у Беларусі і за яе межамі.

Асабліва варта адзначыць яго навуковы падыход у дзейнасці мясцовых саветаў у гістарычнай рэтраспектыве. Вынікі даследавання былі прадстаўлены ў манаграфіі *"Фарміраванне і функцыянаванне сістэмы адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу БССР (1919—1991 гг.)"* (2009). Манаграфія *"Станаўленне і развіццё сістэмы мясцовых Саветаў БССР у 1919—1929 гадах"* (2016) прысвечана прававым, арганізацыйным, кадравым і фінансавым асновам функцыянавання мясцовых Саветаў у першае дзесяцігоддзе існавання БССР.

У наступнай манаграфіі вучонага *"Мясцовыя Саветы БССР: арганізацыя, кадры, фінансы (1930—1941 гады)"* (2021) разгледжаны асноўныя этапы трансфармацыі адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу БССР, арганізацыйная структура і функцыі мясцовых Саветаў і іх выканаўчых камітэтаў у 1930-я гг., паказаны асноўныя падыходы да рэгулявання кадравага складу Саветаў (выбарчыя кампаніі, кааптацыя, наменклатура) і іх практычная рэалізацыя ва ўмовах Савецкай Беларусі, раскрыты пытанні працоўнага заробку савецкіх дзяржаўных службоўцаў, вызначаны этапы, формы і сродкі барацьбы дзяржавы са злачынствамі ў дзяржаўных органах, дадзена характарыстыка мясцовых бюджэтаў як фінансавай асновы дзейнасці мясцовых Саветаў.

У якасці суаўтара С.А.Елізараў падрыхтаваў матэрыялы да манаграфіі *"Органы дзяржаўнай улады і кіравання Савецкай Беларусі (1917—1920 гг.)"* (2017). Навуковец з'яўляецца аўтарам і суаўтарам навукова-метадычных дапаможнікаў, у тым ліку з грыфам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

Пад кіраўніцтвам даследчыка выкананы шэраг навукова-даследчых прац, у тым ліку па тэме *"Мясцовыя органы дзяржаўнай улады і кіравання Беларускай ССР — Рэспубліке Беларусь: арганізацыйныя, прававыя, матэрыяльна-фінансавыя і кадравыя асновы функцыянавання (1944—2020 гг.)"* на 2021—2025 гг. падпраграмы *"Гісторыя дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў "Грамадства і гуманітарная бяспека беларускай дзяржавы"*.

Прафесар С.А.Елізараў прымае актыўны ўдзел у дзейнасці экспертнага савета ВАК Рэспублікі Беларусь па гістарычных навуках, рыхтуе экспертныя заключэнні па доктарскіх і кандыдацкіх дысертацыях як прызнаны ў Рэспубліцы Беларусь эксперт, рэцэнзент навуковых прац даследчыкаў гісторыі.

Сяргей Аляксандравіч з 1995 г. шмат часу аддае рабоце па фарміраванні ў студэнцкай моладзі, якая навучаецца ў вышэйшай тэхнічнай навучальнай установе, цікавасці да гісторыі тэхнікі і інжынернай прафесіі. Пад яго кіраўніцтвам студэнты з інтарэсам удзельнічаюць у навукова-даследчай дзейнасці студэнцкага навуковага гуртка "Інжынер-гуманітарый". Яго чальцы выступаюць на студэнцкіх навуковых канферэнцыях, конкурсах творчых работ абласнога і рэспубліканскага ўзроўняў. С.А.Елізараў у якасці суарганізатара праводзіць адкрыты патрыятычны конкурс *"Салдаты Вялікай Перамогі"* па Гомельскай вобласці. Па яго выніках ім падрыхтаваны да выдання матэрыялы творчых работ удзельнікаў.



*С.А.Елізараў у якасці эксперта сярод удзельнікаў навуковай дыскусіі.*

З актыўным удзелам юбіляра ладзіцца традыцыйная міжнародная навуковая студэнцкая канферэнцыя *"Беларусь у сучасным свеце"*. Яна стала сапраўднай дыскусійнай пляцоўкай, на якой абмяркоўваюцца розныя погляды і абгрунтаванні гістарычных, эканамічных і сацыяльных адносін, а таксама месца і значэнне Беларусі ў свеце.

Навуковую працу Сяргей Аляксандравіч паспяхова спалучае з выкладчыцкай. Для супрацоўнікаў гуманітарна-эканамічнага факультэта ён праводзіць адкрытыя вучэбныя заняткі, майстар-класы, на якіх дэманструюцца напрацаваныя эфектыўныя метадычныя прыёмы і сродкі арганізацыі вучэбнага працэсу. У студэнцкай аўдыторыі гісторык-прафесіянал знаёміць моладзь з фактамі і падзеямі, якія вызначаліся ў фарміраванні беларускай дзяржаўнасці, прыводзіць высновы аб своеасаблівасці гістарычнага шляху беларускага народа, аб чым сведчаць архіўныя дакументы, звяртае ўвагу на тыя аспекты, якія патрабуюць даследавання.

За шматгадовую навуковую, педагагічную і выхаваўчую працу, высокія дасягненні ў выкананні навуковых даследаванняў і выхаванні студэнцкай моладзі С.А.Елізараў узнагароджаны граматамі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай універсітэта, занесены на ўніверсітэцкую Дошку гонару. Яму неаднаразова выказваліся падзякі ад Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў.

Моцны характар і воля, разумная патрабавальнасць і разважлівасць, добразычлівасць, інтэлігентнасць, фізічная і душэўная гармонія, невырагодная працавітасць вызначаюць прафесара С.А.Елізарава. Ён карыстаецца павагай сярод выкладчыкаў, студэнтаў і супрацоўнікаў універсітэта.

Шчыра віншуем калегу і жадаем юбіляру моцнага здароўя, творчых поспехаў і новых дасягненняў!

**Святлана КАЦУБА,**
*загадчык кафедры сацыяльна-гуманітарных і прававых дысцыплін Гомельскага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта імя П.В.Сухога, кандыдат юрыдычных навук, дацэнт*

*Рэдакцыя "Беларускага гістарычнага часопіса" далучаецца да віншаванняў і выказвае найлепшыя пажаданні ў сувязі з юбілеем!*